Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

31 САКАВІКА 2018 г. СУБОТА № 62 (28678)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Цяпло і радасць веры

**Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Вялікдзень 1 красавіка 2018 года**

Дарагія суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Вялікаднем!

У гэтыя цудоўныя дні мы звяртаемся да каштоўнасцяў, якія ляжаць у аснове хрысціянства, праслаўляем высакародныя ідэалы гуманізму, імкненне да міру і справядлівасці.

Бязмежная міласэрнасць і глыбокая вера схіляюць людзей да спагады, а трапяткія адносіны да шматвяковых духоўных традыцый дораць надзею на перамогу дабра ў кожным кутку нашай планеты.

Вялікдзень нагадвае нам пра высокае прызначэнне чалавека служыць блізкім і дапамагаць тым, хто пакутуе, пра важнасць узнімацца над мітуснёй і дробным разладам, дасягаць згоды ў дамах і сем'ях.

Няхай светлае свята Уваскрэсення Хрыстовага прыўнясе ў ваша жыццё цяпло і радасць вясенняга адраджэння.

Моцнага вам здароўя, шчасця і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Вольга ТАРАСЕВІЧ, начальнік упраўлення прамога падаткаабкладання галоўнага ўпраўлення метадалогіі падаткаабкладання арганізацый Міністэрства па падатках і зборах:**

*«Радыкальных змен падатковага заканадаўства, хутчэй за ўсё, не будзе. Але плануецца змяніць механізм вылічэння шграфу падаткаў, спрасціць іх адміністраванне. Нейкія механізмы мы наогул плануем адмяніць, іншыя — удасканаліць такім чынам, каб іх лёгка можна было ўжываць на практыцы. Таксама прадугледжваецца зніжэнне падатковай нагрузкі. Гэта плануецца зрабіць не за кошт выдзялення дадатковых ільгот, а за кошт прымянення іншага механізма разліку самой сумы падатку».*

ISSN 1990 - 763X

# Пасха — шлях у будучыню



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Пастырскае пасланне Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Вялікдзень 2018 года

**Глыбокапаважаныя святары, кансэкраваныя асобы, браты і сёстры, людзі добрай волі!**
**Хрыстус уваскрос! Сапраўды ўваскрос!**



Гэтым пасхальным воклічам вітаю ўсіх вас у самае галоўнае свята хрысціянства — Пасху Хрыстову. Сёння мы засяроджваемся на вечна жывой і актуальнай праўдзе нашай веры аб уваскрэсенні Хрыста. Нездарма святы апостал Павел вучыць, што, «калі Хрыстус не ўваскрос, то марнае і прапаведаванне нашае, і вера ваша марная» (1 Кар 15, 14). Таму ўваскрэсенне Хрыста — гэта падмурак нашай веры.

Мы з настальгіяй успамінаем тыя месцы, дзе нарадзіліся, правялі дзіцячыя гады і ўзрасталі, і адначасова ўсведамляем, што мінулага нельга вярнуць, нельга павярнуць гадзіннік нашага жыцця назад.

Гэтую праўду вельмі добра зразумела Марыя Магдалена ў велікодную раніцу. Яна не хацела нічога іншага, як толькі вярнуцца ў былыя добрыя часы, як мы часта кажам, каб адчуваць сябе так, як быццам ніколі не было трагедыі жахлівай пятніцы з укрыжаваннем Езуса на Галгофе.

Ці можам мы цяпер перанесціся ў тыя часы, калі Езус навучаў на берагах Галілейскага возера, чыніў цуды, суцяшаў бедных? Ці можам павярнуць гадзіннік назад? Мы можам суперажываць Марыі Магдалене, але не можам затрымаць часу і павярнуць яго назад.

Навука і сучасныя тэхналогіі, калі не абяцаюць павярнуць час назад, то імкнуцца, прынамсі, яго запаволіць. Салоны амаладжэння і касметалагічныя кабінеты становяцца ўсё больш папулярнымі. Аднак іх абяцанні не вырашаюць галоўнага, а менавіта не гарантуюць вечнага жыцця і шчасця.

Калі такія і падобныя сучасныя тэндэнцыі стараюцца затрымаць час, то Пасха вядзе нас наперад.

Пасха — па-габрэйску «Пэсах», што азначае «пераход». Габрэі святкавалі Пэсах на ўспамін цудоўнай ночы, калі яны пакінулі Егіпет — месца свайго рабства. Перад імі адкрыўся шлях у будучыню, у зямлю абяцаную.

СТАР. 4

■ Будзь у курсе!

## ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЛЯ ВЫПУСКНІКОЎ І РАБОТАДАЎЦАЎ

**Кар'ерны форум арганізуе 3 красавіка БДУ. У аснову канцэпцыі мерапрыемства пакладзена ідэя мадэлі «Універсітэта 3.0.»: удасканаленне ўзаемадзеяння ВНУ з заказчыкамі кадраў і ўмацаванне сувязяў паміж універсітэтамі і прадпрыемствамі.**

— Асноўная задача «Кар'ернага форуму БДУ — 2018» заключаецца ў гарманізацыі сувязяў і наладжванні ўзаемадзеяння ў ланцужку «работадаўца—універсітэт—студэнт». Мы адкрытыя да прапаноў ад заказчыкаў і студэнтаў па ўдасканаленні сістэмы працаўладкавання маладых спецыялістаў, — падкрэслівае **начальнік упраўлення кадраў Белдзяржуніверсітэта Наталля НЯПЕЎНАЯ.** — Форум стане той пляцоўкай, дзе кожны зможа агучыць не толькі свой пункт гледжання на арганізацыю супрацоўніцтва, але і заявіць пра ўласныя мэты, інтарэсы і патрэбы.

Праграма секцыі для студэнтаў уключае мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне навыкаў самапрэзентацыі, праходжання гутаркі, складання рэзюмэ. Ім будзе прапанавана наведаць майстар-класы па развіцці асобасных якасцяў, прайсці экспрэс-інтэрв'ю з работадаўцамі і атрымаць рэкамендацыі па пошуку работы. У рамках форуму разгорнецца традыцыйны «Кірмаш вакансій» з удзелам больш як 30 айчынных і міжнародных кампаній. Наведаць яго змогуць студэнты любой ВНУ.

Упершыню будзе арганізаваны конкурс «Відэарэзюмэ». Гэта ўнікальная магчымасць для моладзі асвоіць тэхніку складання сучаснага рэзюмэ. Усе зарэгістраваныя студэнты змогуць на працягу двух дзён прайсці навучанне па складанні прэзентацыйнага роліка.

СТАР. 3